1. Перайменаванні вуліц горада — гэта састаўная частка палітыкі нямецка- фашысцкіх улад у дачыненні да акупаваных тэрыторый.
2. Перайменаванні былі неабходны акупантам не толькі ў прапагандысцкіх, але і ў практычных, вайскова-паліцэйскіх мэтах.
3. Перайменаванне вуліц у гонар дзеячоў беларускага нацыянальнага руху — гэта адлюстраванне спробы немцаў прыцягнуць да супрацоўніцтва частку беларускага грамадства.
4. Беларускі нацыянальны асяродак быў незадаволены афіцыйным перайменаваннем вуліц і плошчаў горада.
5. Час нямецка-фашысцкай акупацыі для ўрбананіміі Мінска быў характэрны суіснаваннем старых і новых назваў у дакументах і на старонках газет і пераважным ўжываннем даваенных назваў у побыце.


1. Беларуская газэта. 1943, 7 студзеня, 14 студзеня, 21 студзеня.
2. В непокорённом Минске. Документы и материалы о подпольной борьбе советских патриотов в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1987.
3. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 623, воп. 1, спр.1
4. Кнатько Г. Минск в годы оккупации // Народная газета. 1993. 3 июля.
5. Менская газэта. 1941, 21 верасня, 28 верасня.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33а, спр. 689
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 409, воп. 1, спр. 1
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 411, воп. 1, спр. 6
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 1, спр. 16


## РЭАКЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ НА ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ.


І. Гетман

г. Брэст, БрДУ ім. А.С. Пушкіна


Традыцыйна, гаворачы пра пачатак савецка-нямецкага канфлікту летам 1941 года, савецкая гістарычная навука (а часта ўслед за ёю і сучасная беларуская) адназначна трактуе пазіцыю ўсяго беларускага насельніцтва ў ім як прасавецкую і антынямецкую. Такі падыход нельга лічыць аб'ектыўным.

Пры гэтакай трактоўцы не звяртаецца ўвага на тое, што БССР на 22 чэрвеня 1941 года – няўстойлівая адміністрацыйная адзінка, злепленая з дзвюх амаль роўных па тэрыторыі і насельніцтву частак беларускай этнічнай тэрыторыі, што на працягу ледзь не 20 год знаходзіліся ў складзе варожых адзін аднаму палітычных арганізмаў.

Нягледзячы на жорсткую саветызацыю Заходняй Беларусі ў 1939 – першай палове 1941 гадоў, прывесці да поўнай лаяльнасці жыхарства так і не давялося, і не ў апошнюю чаргу з-за пастаянных чутак пра будучую вайну, якая была павінна пакласці канец савецкай прысутнасці.

"Па вялікім рахунку, страху перад вайною не было, – пішуць у сваёй кнізе "Пинские евреи" Я.С. Разэнблат і І.Э. Яленская – Разхожым было сцверджанне: "горш, чым цяпер – не будзе" (1).

Ад рэпрэсій 1939-1941 гадоў пацярпелі ўсе станы і нацыянальнасці Заходняй Беларусі. Але ці не найбольш жорстка рэпрэсійная хваля прайшлася па эліце грамадства. Да апошняй трэба адносіць не толькі польскую, але і беларускую, у першую чаргу незалежніцкую, інтэлігенцыю.

Пад незалежніцкай інтэлігенцыяй мы разумеем тую адукаваную частку грамадства, што бачыла палітычную будучыню сваёй краіны ў ажыццяўленні на справе акту 25 сакавіка 1918 года, калі была абвешчана незалежнасць Беларусі. Дзеячаў незалежніцкага кірунку было параўнальна няшмат з шэрагу прычынаў, галоўнай сярод якіх трэба лічыць палітыку польскіх уладаў, скіраваную на недапушчэнне фармавання новых кадраў беларускай інтэлігенцыі ў краі і пастаянны пераслед старэйшых удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху, што жылі ў Заходняй Беларусі ад часоў Расійскай імперыі, ці пасля вяртання дадому з Пражскага універсітэту, дзе навучаліся дзякуючы намаганням ураду БНР.

Савецкі Саюз у адносінах да беларускага нацыяналізму праводзіў яшчэ больш жорсткую палітыку, чым Польшча. На працягу 1930-х гадоў у СССР метадычна знішчаліся рэальныя ці

патэнцыйныя носьбіты ідэі сепарацыі Беларусі. У 1939 годзе гэта палітыка была перанесена ў Заходнюю Беларусь. Незалежнікі былі пастаўлены перад пагрозаю фізічнага знішчэння.

Неўзабаве тая пагроза пачала ажыццяўляцца. Беларуская грамадскасць за паўтары гады савецкай улады панесла значныя страты, сярод якіх ці не самай адчувальнай была дэпартацыя Антона Луцкевіча – пачынальніка беларускага руху, духоўнага лідэра адраджэнскага руху ў Заходняй Беларусі.

Выбух вайны 22 чэрвеня 1941 года адводзіў ад пазасталай на Бацькаўшчыне нацыянальнай інтэлігенцыі пагрозу фізічнага знішчэння. Таму рэакцыя на пачатак ваенных дзеянняў была адна – станоўчая. Гэта рэакцыя вагалася ад стрыманай да вельмі эмацыйнай (у залежнасці ад таго, наколькі блізка той ці іншы аўтар успамінаў пра падзеі тых дзён, сутыкнуўся з савецкай рэчаіснасцю).

Цікавыя успаміны пра пачатковы перыяд вайны пакінулі Ф. Аляхновіч, Я. Малецкі, Б. Рагуля, іншыя сведкі тых падзеяў.

Ф. Аляхновіч, вядомы беларускі драматург, "бацька беларускага тэатра", у 1927-1933 гадах адбываў пакаранне ў Салавецкім лагеры. Пасля вяртання ў Вільню выдаў успаміны пра гады зняволення "У капцюрох ГПУ". Існаванне гэтых успамінаў прымушала ўнікаць новай сустрэчы з бальшавікамі пасля іх прыходу ў Вільню ў 1940 годзе: "Дык няма дзіва, што першыя гукі ўзрываў нямецкіх бомбаў паказаліся мне цудоўнай райскай музыкай, якая спявала мне аб вызваленні ... " (2).

Я. Малецкі быў сябрам Беларускага Народнага Аб'яднання (былой Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі). Удзел у працы БНА (БХД) быў прычынай арышту многіх паплечнікаў Малецкага. Пра першы дзень вайны ён піша:"22 чэрвеня 1941 году Вільня як быццам замерла. Глянуў я ў вакно – вуліцы пустыя. Уключыў лёнданскае радыё й зараз пачуў перадачу Бі Бі Сі: "Ноччу немцы перайшлі савецкую граніцу ды ідуць наперад!" Значыцца вайна! Мне заняло дух ад радасці – прыходзяць канцы бальшавікам!"(3).

Эмацыйнае ўзрушэнне ў разглядаемы час перажыў беларускі савецкі паэт Масей Сяднёў, які здолеў уцячы з калоны вязняў, якіх вялі на расстрэл, дзякуючы налёту нямецкай авіяцыі. Сваім выратавальнікам ён падзякаваў вершам, дзе былі радкі з пажаданнем найлепшай удачы незнаёмым лётчыкам.

Нават Якуб Колас, класік беларускай літаратуры, "абласканы" савецкай уладай, паводле сведчання Дз. Касмовіча, не збіраўся пакідаць Мінск напярэдадні захопу яго нямецкай арміяй. Магчыма, Коласа проста прымусілі эвакуявацца.

Можна было б працягваць шэраг падобных да вышэйпрыведзеных фактаў і сведчанняў прадстаўнікоў разглядаемай групы, аднак тэндэнцыя будзе тая самая. Згаданых аўтараў можна, канешне, асудзіць і заклеймаваць як здраднікаў, памагатых нацыстаў і г.д. Аднак зрабіць гэта не дазваляе некалькі прычынаў.

Нягледзячы на брак інфармацыі пра гітлераўскую Нямеччыну, існавала ўсведамленне нацыянал-сацыялістычнага рэжыму, як злачыннага, хаця ён на момант пачатку вайны разглядаўся як меншае зло ў параўнанні з савецкім ладам.

Акрамя таго, у адрозненне ад шырокіх пластоў грамадства, якія хаця і былі незадаволены савецкім рэжымам, але мелі цьмяныя палітычныя ўяўленні, што да будучыні Радзімы, некамуністычная інтэлігенцыя мела ясную палітычную мэту – адбудову нацыянальнай дзяржаўнасці – у рэалізацыі якой спадзявалася на падтрымку Нямеччыны.

Такая ілюзія была ў большай ці меншай ступені характэрна ўсім недзяржаўным народам, заціснутым паміж Нямеччынай і СССР.

Ілюзія гэта падтрымлівалася стварэннем пры дзейсным нямецкім удзеле "дзяржаўнасці" Славакіі, пазней Харватыі, што давала надзею на працяг гэтага ланцуга іншымі бездзяржаўнымі славянскімі краінамі – Беларуссю і Украінай.

Нямеччына, у сваю чаргу, гэтую ілюзію не разбурала, аднак даваць пэўныя гарантыі не спяшалася. Планы каланізацыі Усходняй Еўропы не афішаваліся, у сродках масавай інфармацыі высмейваліся савецкія згадкі пра іх (пасля пачатку вайны з СССР), "Mein Kampf", якая ўтрымлівала злосныя выпады супраць славянства, не прадавалася на акупаваных тэрыторыях (цікаўныя маглі прыдбаць яе толькі ў Нямеччыне).

Калі стала відавочная суровая рэальнасць акупацыі, ілюзіі пачатковага перыяду вайны развеяліся. Аднак адваротнага шляху для тых, хто неабдумана звязаў свае надзеі з Нямеччынай, не існавала. Па сутнасці, незалежніцкая інтэлігенцыя стала закладнікам канфлікту двух таталітарных рэжымаў. Сітуацыя была такая, што дзеля выжывання патрэбна было рабіць выбар, хаця якраз самога выбару не было.

Частка ўспамінаў абыходзіць, або вельмі сціпла згадвае першыя дні савецка-нямецкага канфлікту. Асабліва гэта адносіцца да ўспамінаў, што з'явіліся пасля вайны.

Увогуле, пасляваенныя ўспаміны ў значнай ступені адрозніваюцца ад тых, што пісаліся да 1944 года. Зразумелая спакуса паказаць сваю прадбачлівасць і мудрасць, але ўскосныя дадзеныя дазваляюць сумнявацца ў шчырасці большасці з тых, хто абыходзіць гэты момант.

У большасці сваёй аўтары такіх успамінаў з першых дзён нямецкай акупацыі ўключыліся ў актыўнае супрацоўніцтва з акупантамі. Не ідэалізуючы новы рэжым, тым не менш яны спадзяваліся на пэўныя саступкі з яго боку, асабліва ў параўнанні з папярэднімі – польскім і савецкім.

Першыя месяцы акупацыі давалі на гэта спадзяванне – была атрымана хаця б культурная свабода, якой не было ні пры польскай адміністрацыі ў Заходняй Беларусі, ні пры савецкай ва Ўсходняй. Барыс Рагуля пісаў пра першыя месяцы вайны: "У 1941-42 гадох адбыўся вялікі ўздым беларускай культуры ... 1941-42 гады сталі залатым годам беларускай культуры. Каб нам яшчэ пару гадоў сапраўднай свабоды, такой культурнай свабоды, наш народ, наша нацыя хутка адрадзілася б і ўстала нароўні з іншымі свабоднымі народамі свету" (4).

Аднак, далейшых уступак не было. Нягледзячы на некаторыя шырока разрэкламаваныя акцыі палітычнага характару, рэальная ўлада да канца акупацыі працягвала заставацца ў нямецкіх руках.

Надзеі на раўнапраўнае супрацоўніцтва не спраўдзіліся: нацыяналістаў прымусілі ісці ў фарватэры нацысцкай палітыкі. Нязгодных было няшмат, бо нязгода азначала смерць. Так, напрыклад, Вінцэнт Гадлеўскі, які 22 чэрвеня 1941 года па берлінскім радыё звярнуўся да народу Беларусі з заклікам падтрымаць нямецкае ўварванне ды выступіць супраць бальшавізму (5), у хуткім часе расчараваўся ў нямецкай палітыцы і адкрыта пачаў выяўляць нязгоду. Гэта прывяло да арышту і забойства ксяндза (6).

Пасляваенныя ўспаміны, як правіла, стараюцца высвятліць факты апазіцыйных настрояў у дачыненні да немцаў у асяроддзі беларускіх незалежнікаў і замоўчаць самыя адыёзныя старонкі сваёй дзейнасці перыяду вайны. Да астатніх можна аднесці найперш падтрымку (як мінімум, у сродках прапаганды) акупацыйнай палітыкі ў адносінах да яўрэяў. Неўзабаве пасля Другой сусветнай вайны беларуская эміграцыя на Захадзе прынесла прабачэнне яўрэйскаму народу за сваю падтрымку тагачаснай нямецкай палітыкі. Для прыкладу можна прывесці выступленне Аўгена Калубовіча на Другім Усебеларускім кангрэсе, надрукаванае ў 1954 годзе ў Мюнхене ў кнізе "Другі Усебеларускі кангрэс", дзе былі знятыя ўсе антысеміцкія выказванні, якія мелі месца ў рэальнасці (7).

Прычына рэтушавання ўспамінаў зразумелая: усе тыя спадзяванні, што ўзніклі летам 1941 года, не спраўдзіліся. Ні адзін з ваюючых бакоў не разглядаў магчымасці атрымання незалежнасці Беларуссю ў часе сусветнага канфлікту.


1. Розенблат Е.С., Еленская И.Э. Пинские евреи. 1939-1944 гг. – Брест, 1997. – С. 58.
2. Аляхновіч Ф. У капцюрох ГПУ. – Мн., 1994. – С. 26-27.
3. Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. – Таронта, 1976. – С. 43.
4. Юрэвіч Л. Жыццё пад агнём. – Мн., 1999. – С. 153.
5. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сёньня. – Мн., 1993. – С. 257-258.
6. Рудовіч С.С. Гадлеўскі Вінцэнт // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мн., 1997. – Т. 4. – С. 422.
7. Другі Усебеларускі кангрэс. – Мюнхен, 1954.


## ВОЕННЫЕ ДЕНЬГИ ГЕРМАНИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В ГОДЫ ПЕРВОЙ И ВТОРОЙ МИРОВЫХ ВОЙН.


А.Н.Баюра

*г.Брест, БГТУ*


В литературе, посвященной проблемам первой и второй мировых войн, чаще всего рассматриваются социально-политические и сугубо военные вопросы, реже – экономические, а валютно-финансовые отношения чаще всего остаются вне поля зрения авторов. В то же время это достаточно интересный объект для исследования, так как воюющие страны выпускают на оккупированных ими территориях противника различные военные деньги.

В широком смысле слова под военными деньгами понимаются любые деньги, которые чеканились или печатались в военное время и определенным образом отличались от обычных. В узком смысле – это особые денежные знаки, выпускавшиеся во время войны одним государством на территории другого с целью финансирования